роде был заложен парк Победы, а в 1982 г. в нем возведен мемориальный комплекс в честь освободителей.

Война показала нам, что человек, у которого забирают его родину, готов на все. Он готов бороться до конца, отдавать все силы, даже пожертвовать собственной жизнью для освобождения родного края. То место, с которым его связывают самые важные воспоминания, то место, где произошли события, изменившие его жизнь, то место, которое помогает человеку разобраться в себе и восполняет его энергией, – это его родина. Место, которое есть у каждого, у каждого человека оно своё, но одинаково дорого всем.

***Сігаева В.Л.***

## Чэрвеньшчына ў Вялікай Айчыннай вайне

***Навуковы кіраўнік Жогаль Н.М.***

Гісторыя кожнага горада унікальная і непаўторная. Нездарма ў кожным горадзе ёсць музеі, алеі славы і святы дня нараджэння горада. Калі вы зацікавіцеся гісторыяй свайго роднага горада, вы будзеце здзіўлены, даведаўшыся, колькі цікавых фактаў і падзей адбывалася зусім побач, ці нават на тым месцы, дзе вы знаходзіцеся, як шмат унікальных людзей выгадавана тут. Толькі ведаючы гісторыю свайго горада, родных мясцін можна з гонарам расказваць пра іх знаёмым, блізкім і сябрам. Я нарадзілася ў самым прыгожым месцы – горадзе Чэрвені.

Абшары маёй Радзімы бязмежныя. Можна ўсё жыццё падарожнічаць па гарадах і пасёлках, можна суткамі распавядаць і апісваць іх прыгажосць, але ў кожнага сваё разуменне з гэтай нагоды і тое, што з`яўляецца родным і прыгожым для мяне, можа быць не такім прыемнымдля кагосьці іншага. Калі паглядзець з аднаго боку, то ўсё вакол аднолькава, а з другога – усё такое featrознае.

22 чэрвеня 1941г. пачалася Вялікая Айчыная вайна – самая цяжкая і жудасная з усіх перажытых нашай Радзімай.Уварванне гітлераўскіх полчышчаў было вераломным, падпісаны ў 1939г. Рыбентропам і Молатавым пакт аб ненападзе аказаўся пустой паперкай [2, с. 21].З першых дзён вайны часці Чырвонай Арміі, якія стрымлівалі націск ворага, неслі вялікія страты. Ваенныя дзеянні

разгортваліся з імгненнай хуткасцю. Вогненны вал вайны няўмольна каціўся на ўсход. Танкавыя і матарызаваныя дывізіі праціўніка вялі наступленне па ўсім фронце. Варожыя бамбардзіроўшчыкі няспынна вялі агонь па войсках, якія адыходзілі з баямі.

На захопленай тэрыторыі гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым, – рэжым тэрору, гвалту, забойстваў, рабавання. Усё было накіравана на знішчэнне савецкай дзяржавы, савецкіх людзей. Гэта адпавядала планам А. Гітлера: весці вайну на ўсходзе на вынішчэнне, каб ператварыць усходнія землі ў «жыццёвую прастору» для немцаў. Жыхары Чэрвеня і раёна, якія не жадалі заставацца на акупіраванай тэрыторыі, уліваліся ў паток бежанцаў з Мінска і рухаліся на ўсход на магілёўскай шашы,па бабруйскай дарозе. Многіх бежанцаў пад пагрозай растрэлу акупанты вярталі на ранейшыя месцы пражывання, нямала загінула пад абстрэлам і бамбёжкамі [1, с. 43].Так для жыхароў Чэрвеньшчыны пачаліся 1095 дзён і начэй гітлераўскай акупацыі. Пад час вайны ў Чэрвені працавалі біржа працы і друкарня. Летам 1941г. пачала выходзіць «Чэрвеньская газета». З 1943г. пачала выходзіць газета «Новый путь». Друкаваліся загады і распараджэнні акупацыйных улад, лістоўкі прапагандысцкага характару.

Усе свае няўдачы на фронце гітлераўцы вымяшчалі на мясцовым насельніцтве. Аб гэтым яскрава сведчаць шматлікія дакументы. У Чэрвені з 6000 даваенных жыхароў былі знішчаны 4265, з іх 1800 – габрэйскай нацыянальнасці. Вялікія страты панёс кожны сельсавет, кожны населены пункт. Увогуле ў Чэрвеньскім раёне загінулі 7561 мірны жыхар, 1040 чалавек былі вывезены на прымусовую працу ў Германію, з якіх у родныя мясціны вярнуўся 831 чалавек [4, с. 437].

Раён ператварыўся ў руіны і папялішчы. Шэсць разоў падвяргалася нападу гітлераўцаў вёска Рудня, чатыры разы вёска Клінок. З 1943 г. гітлераўцы пачалі бамбіць населеныя пункты раёна, якія ўваходзілі ў партызанскую зону. Былі знішчаны 14 вёсак. У вёсцы Буды ў полымі загінулі 53 жыхары. Не стала вёскі Дубаўруччa. Яе жыхароў карнікі сабралі ў хаце Івана Стрыгі. У адной хаце ўсе змясціцца не маглі. Пачалі сем'ямі выводзіць: адных у пуню, другіх на вуліцу. Іх забілі, а потым спалілі.Не далічыліся на

Чэрвеньшчыне і тых, хто са зброяй у руках пайшоў на барацьбу з ворагам: 3014 чалавек загінулі на фронце, 537– у партызанах.

Чэрвеньскі раён быў вызвалены войскамі 1-га і 2-га Беларускіх франтоў у ходзе Мінскай наступальнай аперацыі (29 чэрвеня – 4 ліпеня 1944г.) на другім этапе аперацыі «Баграціён» [3, с. 231]. 4 ліпеня 1944г. для жыхароў Чэрвеньскага раёна скончыліся тры жахлівыя гады фашысцкай акупацыі. Самымі цяжкімі стратамі былі чалавечыя ахвяры. З улікам мірных жыхароў, што загінулі ад рук карнікаў, агульная колькасць страт склала больш за 11 тысяч чалавек. Адступаючы, фашысцкія варвары спалілі два жылыя кварталы ў горадзе Чэрвень.

Шчодра палітая крывёю воінаў Чырвонай Арміі, партызан і мірных грамадзян, чэрвеньская зямля свята захоўвае памяць аб загінуўшых. У 72 брацкіх магілах пахаваны 9473 чалавекі. Толькі ў Чэрвені і яго наваколлі ў пяці брацкіх магілах і пяці мягілах ахвяр фашызму спачываюць 4588 чалавек [2, с. 174].

Адным з найбольш вядомых кіраўнікоў вызваленчага руху на Чэрвеньшчыне быў Аляксей Флегантаў, які пасля нападу фашысцкай Германіі на СССР актыўна ўдзельнічаў у арганізацыіпартызанскага руху. У лютым 1942 г. ён быў прызначаны камандзірам дыверсійна-знішчальнага кавалерыйскага эскадрону «Баявы» і накіраваны на акупаваную ворагам тэрыторыю Беларусі. З кастрычніка 1942 г. атрад «Баявы» пераўтвараецца ў партызанскую брыгаду «За Радзіму».У знак ушанавання гераічных дзеянняў брыгады па вызваленню ад фашысцкай навалы імем А.К. Флегантава названа вуліца ў Чэрвені, таксама ў горадзе пастаўлены бюст партызанскаму камандзіру, Чэрвеньская СШ № 2 носіць імя А.К. Флегантава [4, с.83].

Жыхары Чэрвеньшчыны памятаюць імёны тых, хто змагаўся і загіну ў на нашай зямлі, хто змагаўся і выжыў, хто стаяў насмерць у барацьбе з фашысцкімі акупантамі.Памяць аб загінуўшых вечна будзе жыць у нашых сэрцах, яна ўвасоблена ў бронзе і граніце, вершах і песнях нашых землякоў. Яна абавязвае нас звяртацца да аналізу глыбінных прычын вайны як з’явы грамадскага жыцця.

Яшчэ старажытныя філосафы казалі аб тым факце, што чалавецтва вялікую частку свайго існавання знаходзіцца ў стане ваеннага канфлікту. Вайна ў гісторыі філасофіі ацэньвалася living рознымі мыслярамі па рознаму. Так, Жан Жак Русо, Махатма Гандзі, Леў

Талстой, Мікалай Рэрых і многія іншыя казалі пра гэтую з'яву як аб найвялікшым загане чалавецтва. Гэтыя мысляры сцвярджалі, што вайна ёсць адна з самых бессэнсоўных і трагічных падзей у жыцці людзей. Некаторыя з іх нават будавалі утапічныя канцэпцыі таго, як можна пераадолець гэта і жыць у вечным міры і згодзе.

Але іншыя мысляры сцвярджалі, што паколькі вайна працягваецца амаль бесперапынна з моманту ўзнікнення дзяржаўнасці і да сённяшняга дня, то ў ёй можна знайсці пэўны сэнс. Напрыклад, італьянскі філосаф 20-га стагоддзя Юліус Эвола быў схільны да бачаннявайны ў некалькі рамантызаваным святле. Ён будаваў сваё вучэнне на ідэі аб тым, што паколькі падчас узброеных канфліктаў чалавек пастаянна знаходзіцца на мяжы жыцця і смерці, то ён знаходзіцца ў сутыкненні з духоўным, нематэрыяльным светам. На думку гэтага аўтара, менавіта ў такія хвіліны людзі здольныя ўсвядоміць сэнс свайго зямнога існавання. Але ці ж можна пагадзіцца з тым, што гэта павінна каштаваць дзесяткі мільёнаў жыццяў на ўсёй планеце? Напэўна, філосафы яшчэ не далі канчатковы адказ на пытанне аб тым, як пабудаваць грамадскае жыццё так, каб не спатрэбілася звяртацца да вайны як адзінага сродку вырашэння наспелых сацыяльных праблем.

**Літаратура**

1. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск, 2004.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры: Мінская вобласць. – Мінск., 1987. Кн. 2.
3. Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск, 1997.
4. Памяць: Гіст. – дакум. хроніка Чэрвеньскага р-на. – Мінск, 2000.

***Краснова А.К.***

**Ушачи и Великая Отечественная война**

***Научный руководитель Жоголь Н.Н.***

У каждого человека есть очень близкое и родное место, где он чувствует себя спокойно и непринужденно. На земле нет такого человека, который бы не испытывал любовь к малой Родине, так